# ЗАВАЁЎНІКІ ГІТАРЫ




Штогод у інтэрнаце № 3 праходзіць конкурс «Battle гітарыстаў». Сёлета ён адбыўся 19 кастрычніка і быў прысвечаны адразу двум святам – Дню настаўніка і Дню маці. У конкурсе прынялі ўдзел як «гаспадары» мерапрыемства, так і госці – студэнты інтэрната № 5. Удзельнікі дэманстравалі свой талент ігры на гітары, а некаторыя – яшчэ і свае вакальныя здольнасці. На гэты раз у складзе журы былі: старшыня студсавета інтэрната № 3 Глеб Куляшоў, лаўрэат конкурсаў «Калейдаскоп талентаў» (2014) і «Battle гітарыстаў» (2015) Кацярына Леановіч і пераможца конкурсу «Калейдаскоп талентаў» (2015) Анастасія Новікава.

Падтрымаць удзельнікаў прыйшлі іх сябры і знаёмыя, якія гучнымі апладысментамі дапамагалі канкурсантам змагацца з хваляваннем. Вялі мерапрыемства прыгожыя дзяўчаты – Аліна Кірылава і Лізавета Паташова.

Вялікае ўражанне на прысутных і членаў журы аказала выступленне Аляксандры Багавец (інтэрнат № 3), якая праспявала ўласцівую для восеньскага надвор'я песню «Непогода». У выніку дзяўчына заняла першае месца. Запомнілася прысутным і выступленне Дзмітрыя Шаткоўскага (інтэрнат № 5), які «запаліў» залу песняй «Спички» і заняў другое месца. А на трэцюю прыступку п'едэстала падняўся Іван Антаненка (інтэрнат № 5) з песняй «Капитал», якую прысвяціў сваёй першай настаўніцы.

Удзельнікі конкурсу атрымалі дыпломы і памятныя падарункі. Усе ж прысутныя былі вельмі задаволеныя сяброўскай атмасферай мерапрыемства.

**Ірына МУРАЎЁВА,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**